# У радзільным аддзяленні раённай бальніцы павіншавалі жанчын

***Заключным мерапрыемствам святочнага Тыдня маці ў раёне стала віншаванне ў радзільным аддзяленні раённай бальніцы жанчын, якія нарадзілі ў гэтыя дні.***




На тыдні нарадзіліся чацвёра дзетак. І што прыемна і адметна, што тры маладыя сям'і сталі шматдзетнымі. У Паліны Салей з аграгарадка Шашкі нарадзілася дзяўчынка, гэта трэцяе дзіця ў сям'і. Наталля Валента з Драздоў таксама нарадзіла дзяўчынку, другое дзіця ў сям'і.




На момант віншавання ў радзільным аддзяленні перад выпіскай знаходзіліся стаўбчанкі Ганна Дзяржаўская і Кацярына Мастоўская. На сучасны момант яны ўжо тшматдзетныя маці, таму што і ў адной, і ў другой сям’і нарадзілася трэцяе дзіця. І ў Мастоўскіх, і ў Дзяржаўскіх ёсць ужо хлопчык і дзяўчынка, і вось такое шчаслівае папаўненне. Урачыстую рэгістрацыю нованароджаных Міхаіла Дзяржаўскага і Вікторыі Мастоўскай здзейсніла начальнік аддзела запісу актаў грамадзянскага стану райвыканкама Надзея Картузава.



З падарункамі і кветкамі павіншавалі жанчын з нараджэннем дзіцяці  старшыня раённай арганізацыі РГА “Белая Русь”Святлана Жыбуль, старшыня раённай арганізацыі Беларускага саюза жанчын Святлана Блашко, першы сакратар раённага камітэта БРСМ Ягор Падольскі.

**Святлана ЖЫБУЛЬ, фота аўтара**